Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-08-20

# Славісты ўсіх краін аб'ядноюцца

**Заўтра ў канцэртнай зале "Мінск" урачыста адкрыецца XV Міжнародны з'езд славістаў. Наша краіна ўпершыню прыме гэты аўтарытэтны ва ўсім культурным свеце форум, які праводзіцца кожных пяць гадоў, пачынаючы з 1929 года. Галоўнымі арганізатарамі XV Міжнароднага з'езда славістаў выступаюць Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Беларускі камітэт славістаў і Міжнародны камітэт славістаў пры актыўным удзеле міністэрстваў адукацыі, культуры і інфармацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама Мінскага гарвыканкама.**

У рабоце з'езда прымуць удзел больш за 600 вучоных з 35 краін: Аўстраліі, Аўстрыі, Беларусі, Балгарыі, Германіі, Ізраіля, Італіі, Іспаніі, Канады, Літвы, Македоніі, Расіі, Славакіі, Украіны, Францыі, Чэхіі, Швейцарыі, Японіі і іншых. І хай не бянтэжыць чытача шырокае прадстаўніцтва неславянскіх краін у гэтым няпоўным пераліку. Справа ў тым, што буйныя навукова-даследчыя цэнтры славістыкі гістарычна існуюць, бадай, пры большасці глабальных універсітэтаў. А цягам апошніх дзесяцігоддзяў у сувязі з узнікненнем новых славянскіх краін і пашырэннем славянскай прасторы цікавасць да "славяншчыны" асабліва павялічылася ва ўсім свеце. Дарэчы, адной з мэт правядзення міжнародных з'ездаў славістаў, побач з садзейнічаннем развіццю славістыкі і падтрыманнем славянскай ідэнтычнасці, з'яўляецца якраз папулярызацыя ведаў пра славянскія мовы і культуры ў неславянскіх рэгіёнах.

Праграма форуму ўключае пленарныя і секцыйныя даклады, круглыя сталы, пасяджэнні спецыяльных камісій, прэзентацыі выстаў, спецыялізаваныя сустрэчы і іншыя мерапрыемствы. Так, у рамках з'езда ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце (галоўная пляцоўка форуму) будзе працаваць выстава славістычнай літаратуры, выдадзенай за апошніх пяць гадоў у розных краінах. І, дарэчы, усе кнігі, дасланыя на выставу, па традыцыі застануцца ў краіне — гаспадыні з'езда.

23 жніўня сябры Міжнароднага камітэта славістаў сустрэнуцца з кіраўніцтвам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, пазнаёмяцца з пастаянна дзеючай экспазіцыяй НАН "Дасягненні айчыннай навукі — вытворчасці" і археалагічнай выставай артэфактаў і рэдкіх кніг.

Важнымі падзеямі форуму абяцаюць стаць два круглыя сталы: "Скарыніяна ў славянскім і еўрапейскім кантэксце" і "Тарас Шаўчэнка: нацыянальнае вымярэнне і сусветны кантэкст (да 200-годдзя з дня нараджэння)".

Наогул жа тэматычны абсяг XV Міжнароднага з'езда славістаў мае быць надзвычай шырокім. Гэта і разнастайныя праблемы славянскага мовазнаўства (славянскія мовы ў параўнальна-гістарычным і арэальным аспектах; гістарычнае апісанне славянскіх моў і дыялекталогія; славянскія мовы і культуры; моўныя сітуацыі ў славянскім свеце; сінхронна-тыпалагічнае і супастаўляльнае даследаванне славянскіх моў; моўныя карціны свету ў славян; камп'ютарная і корпусная лінгвістыка ў даследаванні славянскіх моў), і пытанні літаратуразнаўства, культуралогіі і фалькларыстыкі ў іх узаемадзеянні (славянскі фальклор, міфалогія і традыцыйная духоўная культура; гісторыя славянскіх літаратур і аналіз мастацкага тэксту; літаратура і рэлігія; славянскі пераклад і міжславянскія пераклады; літаратура — філасофія — ідэалогія; літаратурная крытыка і публіцыстыка; праблемы сучасных славянскіх літаратур), і гісторыя, і сённяшні дзень уласна самой славістыкі.

Асобна вылучаны спецыялізаваныя тэматычныя блокі, у прыватнасці, "Электронныя выданні нелітаратурных вусных і пісьмовых тэкстаў", "Нацыянальнае і агульнаеўрапейскае ў славянскай фразеалогіі", "Спадчына духоўнай песеннай культуры паміж славянскім Усходам і Захадам", "Вобразы герояў і іх эвалюцыя ў сучаснай славянскай драматычнай літаратуры", "Фальклор і фалькларыстыка ў свеце постмадэрнізму", "Інтэграваны электронны славістычны фонд бібліятэк свету", "Славянскія нацыянальныя стылі: сучаснасць і перспектывы", "Паралельныя славянскія корпусы", "Каштоўнасці ў культурна-моўным вобразе свету славян і іх суседзяў", "Інфармацыйна-пошукавыя мовы ў сістэме славістычнай інфармацыі", "Беларуская літаратура як мадэль развіцця "малых" славянскіх літаратур", "Моўнае права і славянскія мовы", "Лацінская спадчына і яе ўплыў на развіццё ідэнтычнасцей у землях Польскай Кароны і Вялікага Княства Літоўскага (XVI—XVIII стст.)".

Несумненна, XV Міжнародны з'езд славістаў стане мерапрыемствам агульнадзяржаўнага значэння. Так шчасліва супала, што ён пройдзе ў нашай краіне акурат напярэдадні Дня беларускага пісьменства, які сёлета будзе святкавацца 31 жніўня і 1 верасня ў старажытным Быхаве. Гэтакая міжнародная рэпетыцыя перад нацыянальным святам.

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*

Мікола Чэмер. Славісты ўсіх краін аб'ядноюцца